**Інструкцыя**
**аб правядзенні абласнога конкурсу беларускага народнага гумару**
**“Гумар і жарты Магілёўшчыны”**

1. Дадзеная Інструкцыя ўстанаўлівае парадак арганізацыі, падрыхтоўкі і правядзення абласнога конкурсу народнага гумару “Гумар і жарты Магілёўшчыны” (далей – конкурс).

2. Арганізатарам конкурсу з’яўляецца ўстанова культуры “Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы” (далей – арганізатар).

3. Конкурс праводзіцца ў мэтах падтрымкі, далейшага развіцця цікавасці да беларускага народнага гумару і сатыры, папулярызацыі народнай творчасці, прадстаўлення магчымасці творчага самавыяўлення індывідуальным выканаўцам і аматарскім, непрафесійным калектывам Магілёўскай вобласці праз гумар, сатыру, смех.

4. Асноўнымі задачамі конкурсу з’яўляюцца: павышэнне мастацкага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства індывідуальных выканаўцаў і аматарскіх калектываў мастацкай творчасці Магілёўскай вобласці, узбагачэння іх рэпертуару, распаўсюджванне новых формаў творчай дзейнасці калектываў і выканаўцаў сатырыка-гумарыстычнага фальклору.

5. У конкурсе прымаюць удзел аматарскія калектывы мастацкай творчасці і індывідуальныя выканаўцы вобласці, незалежна ад ведамаснай прыналежнасці, якія маюць у сваім рэпертуары творы беларускага народнага гумарыстычнага накірунку.

6. Удзельнікі конкурсу прадстаўляюць конкурсны нумар на беларускай мове да 5 хвілін па катэгорыях і намінацыях.

**Катэгорыя:**

- саліст;
- малыя формы (да 3-х чалавек);
- калектывы (ад 3-х да 20 чалавек).

**Намінацыя:**

**Гумарыстычны нумар** (сцэнкі, анекдоты, апавяданні, фельетоны, традыцыйны СТЭМ, маналог, пародыі, мініяцюры, дыялогі, байкі і інш.).

**Living Рознажанравыя жарты** (песні-пародыі, жартоўныя песні, куплеты, прыпеўкі, галасавыя пародыі, жартоўны танец, танцавальныя замалёўкі і інш.).

Кожны раён, горад накіроўвае мінімум 2 заяўкі на удзел у кожнай з намінацый.

7. Конкурс праходзіць у два этапы:

**Першы этап праходзіць 30 сакавіка 2023 года** – конкурсны, праводзіцца на базе УК “Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы”.

**Другі этап (кастрычнік-лістапад 2023 года)** – заключны, у рамках абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі “Дажынкі-2023” у г.п.Хоцімску, па дадатковай інструкцыі ад арганізатараў, канкурсанты па

узгадненню з арганізатарамі могуць прыняць удзел у рэспубліканскіх, абласных, рэгіянальных, іншых мерапрыемствах.

5. Для ўдзелу ў першым этапе конкурсу неабходна не пазней за 20 лютага 2023 года накіраваць заяўку (згодна дадатку) на электронны адрас mogomc@mogomc.by альбо па факсу 8 (0222) 759864. Падачу заяўкі ажыццяўляе кіраўнік калектыву, індывідуальны выканаўца, які нясе адказнасць за афармленне заяўкі. Арганізатар конкурсу можа не дапускаць удзельнікаў і калектывы да ўдзелу, у выпадку невыканання ўмоў конкурсу.

УВАГА! На конкурс не дапускаюцца нумары, якія змяшчаюць:

сатырычныя выпады і прапаганду па нацыянальных або рэлігійных прыкметах, заклікі да нацыянальнай нянавісці і варожасці, асабістыя нападкі; ненарматыўную лексіку.

6. Выступленні ўдзельнікаў ацэньваюцца па наступных крытэрыях:

артыстызм;

актуальнасць жартаў;

музычнае афармленне;

сцэнічная культура і выканаўчае майстэрства;

мастацка-эстэтычны і сатырыка-гумарыстычны ўзровень рэпертуару;

выкарыстанне сучаснага і традыцыйнага гумарыстычнага фальклору.

Усе ўдзельнікі конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі ўдзельніка, пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені ў кожнай катэгорыі і намінацыі. Па рашэнні журы могуць быць прысуджаны спецыяльныя дыпломы.

11. Журы пры неабходнасці мае права пераразмеркаваць дыпломы сярод намінацый і ўвесці новыя намінацыі. Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае.

12. Выдаткі, звязаныя з удзелам у этапах конкурсу ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючага боку.

**13. КАНТАКТЫ:**

Аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці 80222 42 42 64

+37544 796 7928 – Аляксандр Мікалаевіч Глуздоў

+37529 748 93 73 – Аляксандр Пятровіч Кузняцоў.

**Дадатак**

Заяўка на удзел абласнога конкурсу
беларускага народнага гумару
"Гумар і жарты Магілёўшчыны"

| | |
|---|---|
| **Поўная назва калектыву/<br>імя, імя па бацьку, прозвішча ўдзельніка<br>(ведамасная прыналежнасць без скарачэння, для дыплома )** | |
| **Імя, імя па бацьку, прозвішча кіраўніка,<br>Кантактны нумар,<br>E-mail** | |
| **Назва нумара, аўтар** | |
| **Працягласць нумара<br>(пазначыць час)** | |
| **Намінацыя** | |
| **Катэгорыя** | |
| **Колькасць удзельнікаў** | |
| **Тэхнічны райдар** | |